ФГиЯК
ВГУ имени П.М. Машерова

Факультэт гуманітарыстыкі і моўных камунікацый

# Літаратурны AUTOGRAPHUM



## Паэтычны нумар "Фенікс"

№ 1
ВОСЕНЬ



## *Шаноўныя філолагі, паважаныя аўтары і проста ўсе неабыякавыя чытачы!*

Прапануем Вашай увазе студэнцкі літаратурны часопіс **“ЛІТАРАТУРНЫ AUTOGRAPHUM”**, які будзе выходзіць у электронным фармаце. Выданне для ўсіх неабыякавых да літаратурнай творчасці філолагаў, для пачынаючых аўтараў, якія спрабуюць свае сілы ў любым жанры паэзіі, прозы, крытыкі, публіцыстыкі на мовах народаў свету. Мы шукаем *сваю аўдыторыю*, сваіх аўтараў і чытачоў, а таксама вызнаём лозунг, што ***слова ўладарыць светам!***

Будзем удзячныя за водгукі на змешчаныя ў часопісе матэрыялы. Будзем радыя прыняць да публікацыі не толькі арыгінальныя творы, але і пераклады з любой мовы. Сярод нашых аўтараў як пачаткоўцы, так і сталыя пісьменнікі з уласнымі кнігамі. Варта заўважыць, што прафесіяналізм творчай асобы заўсёды падмацоўваецца яе асабістымі дасягненнямі, якія патрабуюць настойлівых спробаў і мэтаскіраванага пошуку. Рэдакцыйная калегія часопіса імкнецца да творчага прафесійнага росту, адкрытая да новых ідэй і сумесных праектаў.

Прапануем усім зацікаўленым прачытаць восеньскі “ЛІТАРАТУРНЫ AUTOGRAPHUM”, а плануецца яшчэ зімовы, вясновы і летні нумары, у якіх *можа надрукавацца кожны жадаючы.* З намі можна звязацца ў *Viber*, *Telegram*, *WhatsApp,* а таксама праз *электронны адрас*, які змешчаны на апошніх старонках кожнага нумару.

Чытайце нас! Пішыце нам! Дзяліцеся нашымі публікацыямі! Дапамагайце чытачам адкрываць новыя імёны, а пісьменнікам знаходзіць удзячных чытачоў.

Рэдакцыя часопіса выражае ўдзячнасць рэктару ВДУ імя П. М. Машэрава прафесару Валянціне Васільеўне Багатыровай за падтрымку праекта.



*З павагай,*
*галоўны рэдактар Дар'я Мамошына,*
*студэнтка 41-й групы ФГіМК.*




## Никита Яблоков

27.06.2000 г.,
ФГиЯК, 41 гр., 4 курс

•Одна из любимых и важных книг Харуки Мураками "*Норвежский лес*". Я стал тем, кем являюсь сейчас, в основном благодаря этой книге.

•Любимая цитата: "*Смерть — не противоположность жизни, а её часть*" *(Харуки Мураками)*

•Кредо в литературном творчестве: *"Я должен писать так, чтобы читатель плакал или хотя бы ощутил комок в горле, который трудно проглотить"*.

***

Стены сжимаются
Как огромный
Желудок они дрожат
Переваривают меня
Потом выплёвывают
Через дверь
Затем я возвращаюсь
Обратно
И так каждый день

***

Свинцовый закат растворился в дыму
Ослепнув от солнца я землю скребу
Сквозь дырку в груди вытекает нутро
Зеленое нечто сидит глубоко
Фальшивая кожа дрожит на щеках
Сквозь руки песком рассыпается прах
Забытые кем-то слова на войне
Тяжелым ботинком притопчут к
земле

***

Яго вусны варушыліся і
Танчылі “Малітву”
Пакуль язык кранаўся
Да зубоў як смык да
Скрыпкі
Мармытанее стлала
Песняй адзінокага
Вар’ята
А подых багародзіцы –
Паветра пасля п’янкі

***

В окопах где Бог не бывал никогда
Взорвется упавшая с неба звезда
Осколки пронзившие тело мое
Как иглы сквозь ткани войдут
глубоко
Друзья по оружию в венах земли
Увидели солнце глаза-волдыри
Кротовья улыбка с остатками губ
Украсит забытый собратьями труп

***

Ступья разбросаны по телу
Это индивидуальный узор для каждого
Но ломкие пальцы сдирают куски
Крошатся ногти и срывают куски
Которые отличают нас
Друг от друга
Так я убиваю свое «Я»

***

Часть меня умерла
Часть меня растворилась
В этом я виноват
И все так
Получилось

***

Собака которую никто не видел
Нашла человека
кторого никто не жалел
Собака его пожалела
А человек увидел собаку

***

Попробуй полюбить смерть
и пустоту
Попробуй полюбить то
что другие ненавидят
Пока есть чудовище
которое способно убивать
рядом с ним будет жертва
Способная
Умирать

***

Ворчливые губы
дрожат на ветру
Солдат заблудился в
похмельном бреду
Конуру согревает
буржуйка-хозяйка
Напротив неё в
комуфляже спит стая
собак

***

В угольном море горят маяки
Из кухни напротив скорей маякни
Мотыльки заползают в карманы
шинелей
Где дети лежат обнимая колени
По окнам стекает свинцовый закат
Под эхо снарядов уснет весь барак
Бардак под ногами из плоти и крови
На небе Христос как всегда недоволен



## Екатерина Селезень

08.12.2001г.,
ФГиЯК, 31 гр., 3 курс

•Адна з любімых і важных кніг *«Дыялогі з Богам»* Валянціна Акудовіча.

•Любімая цытата
*"І ён прайшоў, толькі пакінуў па сабе след - упэўненасць у тым, што ва ўсім ёсць смутак і ва ўсім ёсць шчасце..."*
(Кузьма Чорны)

•Кредо в литературном творчестве:
*"Открытку строчек простых я подарю тебе навсегда"*
*(группа Перемотка)*

***

Тёмной ночи лишь сердце открою,
Пусть она мне матерью будет.
Утром рот на замок я закрою,
А она ничего не забудет.
Ветру шумному тайны расскажет,
Чтобы тот мне судьбу напророчил.
А луна в отраженье покажет,
Кто же душу мою опорочил,
Кому сердце своё я раскрыла
И кого же оно не забудет.
К чьей груди я ладонь приложила?
Кого образ мой утром разбудит?
Чёрной ночи я сердце открыла,
Заменять она мать теперь будет.
Сотни лет - ночь ничто не забыла.
И меня ни к чему не принудит...



***

Посмотри мне в глаза
И скажи, что боишься
Быть отвергнутым мной
И к признанью стремишься.
Под сестрою-луной...
Посмотри мне в глаза
И скажи, что в них видишь.
Сколько выпито зла?
Как меня ненавидишь?
Под сестрою-луной...
Посмотри мне в глаза
И скажи, что уходишь.
Вот я снова одна,
А ты всё не приходишь.
Под сестрою-луной...



***

Ты меня солнцем называл.
Наверно, душу тебе грела,
Пока луна мне песни пела
И ветер тихо колыхал.
Ты меня солнцем называл.
Тебе в ночи путь освещала,
Но ты не слышал как кричала,
Когда страх время отмерял.
Ты меня солнцем называл.
В груди то слово трепетало.
И как ночами бормотала,
Когда свет лунный к себе звал.
Ты меня солнцем называл.
Мне это слово душу грело,
А моё сердце томно спело,
Когда ты солнцем называл.

***

Кошмары приходят,
За горло хватают,
А черти мне в косы
Крапиву вплетают,
Всё тянут за руки
И ноги щекочут,
Противные речи
На ухо бормочут.
С ума меня сводят
Те гости ночные.
Весь день в голове
Моей мысли дурные.
Не знаю, что делать.
Никто их не слышит.
Но чувствую как мне
В затылок те дышат.
И музыка их моя
Уж не глушит.
А кто же пожар
В моих мыслях потушит?
Кошмары всё душат...
Всё душат...
И душат...
Пожар кто потушит?

# **Незвычайна** пра Уладзіміра Караткевіча

### **10** цікавых **фактаў**



***У. Караткевіч. 1950***

26 лістапада 2021 года мы святкуем 91 год са дня нараджэння класіка беларускай літаратуры **Уладзіміра Сямёнавіча Караткевіча**. Нарадзіўся пісьменнік у 1930 годзе ў г. Орша Віцебскай вобласці. Як ён сам згадваў у аўтабіяграфіі "Дарога, якую прайшоў", складзенай ім асабіста 1 снежня 1964 года, *"тады гэта быў маленькі гарадок. Зялёныя вуліцы , рэшткі валоў замчышча, гудкі долёкіх цягнікоў і блізкіх параходаў (чыгунка і аўтобусы яшчэ не забілі руху), дубовыя лясы на берагах і ліпы на вуліцах, недалёкія парогі. І, вядома, сотні крыніц па берагах і нашы песні"*.

Уся творчасць пісьменніка - гэта своеасаблівая песня пра Беларусь, песня сапраўды народнага, эпічнага размаху, глыбокага драматызму і высокага паэтычнага ўзлёту.

1. У літаратурнай спадчыне Караткевіча выяўлены 4 творы жанру **адказы на пытанні**, якія пры жыцці пісьменніка не друкаваліся. Першы твор - *"Ответы на вопросы анкеты Юрия Гальперина"* - напісаны на рускай мове, датуецца 1957 і змешчаны ў лісце да яго. Другі твор - *"Адказы на пытанні, звязаныя з тэмай "Нацыянальнае і інтэрнацыянальнае ў духоўнай культуры асобнага народа - як часткі чалавецтва"* - датуецца 1976. Трэці твор - *"Доўгі адказ на тры кароткія пытанні"* - напісаны ў 1976. Найбольшая частка твора - гэта адказ на пытанне "Якія якасці падабаюцца Вам у людзях, што Вас акружаюць?" Чачвёрты твор - *"Адказы на "некаторыя пытанні невялікай анкеты"*.

2. Па творах Караткевіча запісаны **аўдыякнігі** на CD-дысках, у агучванні якіх прынялі ўдзел вядомыя беларускія акцёры. *"Белае полымя"* і *"Лясную гісторыю"* агучыў Г.Гарбук; *"Быў. Ёсць. Буду!": выбранае"*, *"Каласы пад сярпм тваім"*, *"Чорны замак Аальшанскі"*, *"Паром на бурнай рацэ"* - А.Каляда; *"Чазенію"* - І.Курган і інш.

3. **"Батальон желторотых"** - аўтарская заяўка Караткевіча на рускай мове на літаратурны сцэнарый паўнаметражнага мастацкага фільма, падрыхтаваная для Кіеўскай кінастудыі імя А. Даўжэнкі. Датуецца 1962. Паводле некаторых жанравых адзінак фактычна з'яўляецца сінопсісам кінафільма. Да нашага часу не апублікавана.

4. У Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь ёсць выява **Герба "Корвін"** старажытнага шляхецкага роду Караткевічаў, да якога належыў бацька пісьменніка. Да гэтага герба належаць таксама роды матэматыка Соф'і Кавалеўскай і венгерскіх каралёў.

5. Галіна Ільіна, беларускі інжынер, фундатар, у 2017 ахвяравала ўласныя грошы Аршанскаму музею У.С.Караткевіча на стварэнне **радаводу Караткевічаў**. Па словах Ільіной, гэта стала *"данінай вялікай і заслужанай павагі да неардынарнай асобы Уладзіміра Сямёнавіча і яго непаўторнай, неўміручай творчасці"*.

6. **Вобраз Кастуся Каліноўскага** - адзін з цэнтральных у творчасці Караткевіча. Для пісьменніка быў увасабленнем патрыятызму і шчырага служэння беларускаму народу. Паводле Караткевіча, менавіта дзякуючы Каліноўскаму і інш. "шляхецкім рэвалюцыянерам" беларусы ўпершыню за доўгія стагоддзі нацыянальнага і сацыяльнага ўціску напаткалі гістарычную суб'ектыўнасць, пажадалі, кажучы словамі Я.Купалы, "людзьмі звацца".



*Герб **"Корвін"***



**Малюнак, 1948 год. На адвароце Уладзімірам Караткевічам пазначана: «Маляваў, калі было год 18»**

7. Паводле ўспамінаў А.Мальдзіса, *"на пачатку 1967 года"* В.І.Гапава *"разам са сваёй сяброўкай Федзюковай завялі Караткевіча на канцэрт вядомага "ўгадвальніка думак"* ***Вольфа Месінга***". На канцэрце Месінгам было прапанавана з запісаных на картачцы назваў кніг выбраць тыя, аўтарамі якіх з'яўляўся Караткевіч. Месінг дакладна іх вызначыў і сказаў, *"што мае справу з творамі таленавітага чалавека"*. "Угадвальнік думак" прадказаў, што пасля ўсялякіх выпрабаванняў сітуацыя яго як пісьменніка зменіцца да лепшага, прыйдзе прызнанне (*"але будзе ўжо позна"*).

8. Славутая палеская рака **Прыпяць** - улюбёны рэгіён адпачынку і вандровак Караткевіча. Яна была той мясцінай, дзе пісьменнік імкліва аднаўляў і папаўняў уласныя творчыя сілы. Асабліва захапляла яго палескае разводдзе, калі навокал стваралася суцэльнае мора на дзясяткі кіламетраў.

9. З сама ранняга дзяцінства Караткевіча паланіла **Украіна**, яе гісторыя і культура. У сямейнай бібліятэцы было шмат украінскіх кніг. Пісьменнік прызнаваўся, што вершы Т. Шаўчэнкі, Л. Украінкі ведаў *"яшчэ з самых малых год"*. У мастацкай спадчыне Караткевіча ёсць шмат прызнанняў у любові да краіны, якая стала для беларуса *"другой пасля Радзімы"*, адыграла выключную ролю ў працэсе яго самапазнання і духоўнага станаўлення.

10. **Янка Шутовіч** (Іван Іосіфавіч) - беларускі грамадскі і культурны дзеяч, літаратуразнавец і публіцыст. У 1964 пазнаёміўся з Караткевічам, калі той працаваў у архівах Вільнюса. Пісьменнік пісаў пра сустрэчы з Шутовічам у сваім дзённіку. Згадваў яго як аднаго з захавальнікаў беларускай культуры ў Вільнюсе ў нарысе *"Дружба навекі"*, падрыхтаваным для літаратурнага друку.

***Якая ваша любімая цытата Уладзіміра Караткевіча?***
**Адказваюць студэнты ФГіМК.**



**Анастасія Касцюкевіч, 21гр.**

*"Той, хто кахае - бессмяротны".*



**Архіп Дарожкін, 10гр.**

*"Кожны чалавек носіць сваё неба з сабой".*



**Марына Сазонава, 41гр.**

*"Справядлівасць чалавек павінен адчуваць сэрцам, а не законамі ".*



**Дзіяна Галавач, 31гр.**

*"Кожны чалавек хоча кахаць і быць каханым, народжаны для кахання, шукае яго ўсё жыццё, моліцца яму і памірае з думкамі аб ім...".*



**Вольга Карпава, 21гр.**

*"Рабі нечаканае, рабі, як не бывае, рабі, як не робіць ніхто, – і тады пераможаш".*



**Лідзія Сушчык, 41гр.**

*"Хто забыў сваіх продкаў - сябе губляе,*
*Хто забыў сваю мову - ўсё згубіў ".*

**Падрыхтавала Дар'я Мамошына**




## Ганна Віктараўна Навасельцава

Дацэнт кафедры літаратуры

Друкавалася ў абласных перыядычных выданнях, часопісах *«Маладосць»*, *«Полымя»*, штотыднёвіку *«ЛіМ»*, калектыўных зборніках.

Аўтар кніг міфалагічных апавяданняў *«І чарам сніцца чалавек...» (2016)*, сучасных казачных гісторый *«Калі цябе спактае казка...» (2018)*.

### Ліска-чарадзейка

казка

- А ты ж шкода рыжая! А ты ж злая чарадзейка! – грозіцца ды кідае ... рыбінай. А чым яшчэ? Болей жа нічога на возе няма, адно мех з рыбай. Ці не ўвесь пусты...

Дарэмна кідае, усё роўна не трапляе, дзіравыя рукі ў дзеда. Даскочыўшы да густога балотнага хмызняку, ушылася туды спрытнай лісою. Яшчэ чуваць гнеўныя воклічы, але цьху на гэта... Дзед сюды не пасунецца. Хоць, яго праўда, я і хітрая, і ўвішная, і прыгожая. Рыжая ды чарадзейная. Ліса-ліска. Ну і за што не любіць такую? А вось жа не любіць!

Хіба за тое на мяне пакрыўдзіўся, што я зімой разам з ім рыбу лавіла? Дык ведама ж, лісы да рыбы ласыя! І чаго тады злуе? Супынілася, прыслухалася. Пакрычаўшы ды паскрадзіўшыся на жыццё, дзед патупаў назад, да свайго воза. Счакаю яшчэ трошкі, вярнуся, ды ўсю рыбу параскіданую збяру. Хіба дарма старалася, уцякала?

- Лісы ж да рыбы ласыя! – паўтарыла шэраму хмызнякоўніку, які паткнуўся да мяне з вялікай цікаўнасці. – А ты будзеш за дзедам сачыць! Як ён паедзе рыбу лавіць, адразу мяне клікаць!

Вось так! Дзед жа кожнае раніцы спяшаўся рыбаліць, шлях трымаў паўз гэтае балота, то хмызнякоўнік найлепш і дапільнуе. А пакуль што пабягу хутчэй дахаты, няхай гэты няўдалы рыбак са сваім возам на грэблі багністай куляецца!

Прыбегла. І што тут у нас? Баба смятану ў гаршчок сабрала, масла біць старанна ўзялася. Блінцоў пульхлых напякла, відаць, дзеда чакае аж не дачакаецца. А дзед, як на тое, не спяшаецца. Але за тое я ўжо тут... Усміхнулася ж прыязна ды пад вакно. Хвастом сваім сонечным туды-сюды павяла і пытаюся прыязна:

- Бабка, а бабка, што ж ты робіш?
- От недарэка! Не бачыш? Масла б’ю!
- Бабка, а бабка, а для каго масла б’еш?
- От недарэка! Буду дзеда карміць!
- Бабка, а бабка, а ці ведаеш ты, што дзед сёння рыбу лавіў?
- От недарэка! Ведаю, бо дзед кожны дзень рыбу ловіць.
- Рыбу лавіў, а цябе вадзяніку замест рыбы абяцаў аддаць, бо твае блінцы нясмачныя...
- Што гэта, ліска, ты кажаш? Няўжо праўда нясмачныя?
- От недарэка! Ты пра тое падумай, што табе ў вадзяніка нясоладка прыйдзецца, а ты пра блінцы клапоцішся... Ды блінцоў тваіх я не ела, адкуль мне ведаць?
- А ты частуйся, ліска! – ды падае місу цепленькіх праз вакно. – А што ж, так і абяцаў вадзяніку аддаць?
- Ды няхай я хвастом за пень зачаплюся, калі прыдумаю такое! Лавіў твой дзед рыбу, аж выплывае да яго вадзянік. Хопіць, кажа, табе з майго валадарства цягаць, давай што за рыбу.
- А няма ж у мяне нічога, гаворыць дзеду, бедным быў, бедным і застаўся. Адно баба ў хаце, дык жа і тая няўдаліца! Ні зварыць, ні памыць! Адно лаецца дый годзе! Аддам яе, мо стане ціхмянаю, ласкаваю... А блінцы ж твае смачненькія!
- Ты еш, ліска, еш! Што, так і сказаў: ні зварыць, ні памыць? Дык я ж цалюткі дзень адно вару ды мыю! Працую на гэтага лайдака!
- А ты, бабка, лепш сама спытай! – пачуўшы, як воз затарахцеў зусім блізка, вярнула пустую міску ды хуценька – мык у высокае кустоўе, якое шчыльнай сцяной абступіла хату.

Гляджу ды слухаю, што ж далей дзецца будзе. А раззлаваны яшчэ ў дарозе дзедка прытупнуў у хату, кінуў бабцы пусты мех. Што, ніводнай рыбіны? Мех ты бабцы кідаеш дарэмна, гэта не ў мяне, маленькую, сціплую, ды з усёй сілы рыбінай. Вось зараз ты гэтым жа мехам і атрымаеш...

Трэба ж, жыццё прыжыўшы, не навучыўся. Кінуўшы мех, яшчэ і просіць:
- Дай, бабка, што з’есці. Натаміўся, рыбу цягаючы... Страх!
- А ты ж мой бедны! А ты ж мой гаротны! – пастачувала бабка ды плехнула дзеду на галаву смятаны з гаршэчка.

Адчуваю, што масла так і не саб’ецца. А так хацелася свежанькім паласавацца! Шкада! Шкада!

Ах ты ж злая чарадзейка! – засердаваў дзед. – Аддамо цябе вадзяному злыдню, каб мне шкоды не чыніла!

- Я ведаю даўно, што ад мяне і зусім пазбавіцца жадаеш! От я табе! – бабка, пачуўшы пра шкоду, гаршчком у дзеда, ды лыжкай. Ды чапялой...
Але ж як многа ў хаце рознага посуду! Адных збанкоў аж дзевяць налічыла. І дужа імі кідацца бабка! Бывае, цалюткі дзень крэкча ды жаліцца на хваробы. Бач, усё як рукой зняло, радасна глядзець. Тут і дзед сваёй бабцы не саступае: кінуўся па нерат, ухапіў спрытна ды ловіць бабку, як рыбку, нератам.
- А ты ж мая прыгожая! А ты ж мая разумная! А ты ж мая каханая! Хадзі ў нерат! – прыгаворвае бабцы, так і гэтак кідаючы нератовую сетку.
Бабка дзедавай шчырасці пра каханую, разумную і прыгожую не верыла. І ад душы шкадавала, што некалі, даўно-даўно, на гэтыя ласкавыя словы спакусілася. Лепш бы сапраўды з вадзяным жыла! І прыгожы, кажуць, і багаты! А ён, дзед, як быў, так і застаўся галотай. Рыбы налавіць – і тое як здарыцца.
- А ведаеш, трэба ты мне такі! Сама пайду да вадзяніка!
Дзед з неспадзяванкі выпусціў з рук нерат, як не паслізнуўшыся на сухім месцы:
- Ды ідзі ты, куды хочаш! Ці ты думаеш, што вадзяніку такая няўдаліца патрэбная?
- От ужо і няўдаліца! – аж уся скаланалуся з крыўды бабка, завярнулася ды як ёсць патупала да возера, з якога толькі быў прыехаўшы дзед.
Дзед жа за бабкай заспяшаўся. Не пайшоў, не. Паехаў, зручна ўладкаваўшыся на возе. А я ж, такая чарадзейная ліска, не пайшла, не, а пабегла следам.
- Куды ж ты, старая, пешкі прэшся? – дзед з воза бабцы. – Сядай, падвязу...
- А каб цябе чэрці вадзяныя падвозілі! – гэта бабка дзеду. – Сама дайду!
- Ты ж, калі вадзяніка будзеш клікаць, хоць ласкавае слоўца яму скажы! А то ж такая крыклівая каму патрэбная?
- А каб ты чарцям вадзяным быў патрэбны! Без цябе ведаю!
- Ты ж, калі да вядзяніка будзеш прасіцца, скажы, няхай хоць за цябе колькі рыбы дасць! – дзед з воза бабцы. – А то ж усё жыццё пакутую, а без нічога застануся!
- А каб ты чарцей вадзяных прасіў! – гэта бабка дзеду. – Атрымаеш малога ёршыка за ўсе свае пакуты!
- Я чарцей вадзяных ніколі не прасіў! Гэта ж сабе даражэй! А ты да іх сабралася, – дзед трохі ахалануўся і як быццам сумеўся.
А бабка ўжо да возера дабегла. Рукі насустрач вадзе цягне ды так ласкавенька-шчыранька просіць:
- Хвалі глыбокія-глыбокія, віры сінявокія, чары цёмныя ды гнеўныя, вадзянога каралевіча слугі верныя! Не хачу дарма спадзявацца, а хачу з ім спаткацца! Не хачу на ўвесь свет журыцца, а хачу з ім пакут сваіх пазбыцца! Не хачу за шчасце змагацца, а хачу з ім застацца! Вадзянога каралевіча слугі верныя, чары цёмныя ды гнеўныя, віры, як і ён, сінявокія, хвалі глыбокія-глыбокія!

Схапіўся дзедка за галаву, пачуўшы такое, ды на возеры ўжо хавалі гнеўна ўздымаюцца, у бераг моцна плешчуць. Гэта цёмныя чары ўраз адгукнуліся, пачуўшы неасцярожнае бабчына слова. Дык што ж тут можна рабіці? Плач не плач, а з глыбокіх-глыбокіх хваль выходзіць сам вадзяны каралевіч!

- Гэй! Праўда старыя дзейкаюць! – аж не стрымалася бабка. – Як ранак, малады, як неба, прыгожы...

- Гэй! – не стрымаўся і дзед. – Малады, малады! Яшчэ на памяцці майго дзеда такім быў!

А каралевіч між тым блізенька да беражка падыйшоў, гамонку такую слухае ды смяецца:

- А для каго ж гэта я не малады? Для цябе, бабця, што як печаны яблык?

Ды тая і не падумала крыўдзіцца, а захаплення свайго не хавае:

- Варожыць-чарадзеіць над сіняй вадою! Дзівосы розныя кліча!

- А як жа! – азваўся і дзедка. – Варожыць... Віхуры пасылае, навальніцы ўшчынае, людзей ад возера жахлівымі зданнямі адганяе, каб не стараліся многа! Як прымроіцца такі жах у вечаровым тумане, дык пра ўсё забудзеш!

Каралевіч жа ў адказ:

- А ты ж дзедка! А ты ж смелы! Рыбу кожнага дня цягаеш ды яшчэ мяне абражаеш! Як быццам я не пра возера клопат маю, а так сабе цёмнымі чарамі баўлюся. Ды і моракам хіба ж напалохаеш цябе...

Дзед на тое не змаўчаў:

- Цьху, нечысць, што цябе баяцца! Каб мог мяне ўтапіць, то ўжо, пэўна б, утапіў. А так...

- А так гляджу на вас, добрых, шчаслівых, дый думаю сабе... – недаказаў вадзяны каралевіч.

- Што забярэш мяне ў падводнае каралеўства, срэбрам абсыпеш, чарамі адорыш ды будзеш мне ў вочы глядзець, – усхапілася бабка.

Каралевіч ды дзед скоса пераглянуліся, нібы каўтнуўшы чаго кіслага, а каралевіч цвёрда прамовіў:

- Не!

- От я ведаю! – не ўтрываў дзед. – Дурніцу гэтую старую прэч пагоніш, каб яна болей да возера і не думала хадзіць! А то чары ды срэбра ёй спатрэбіліся... Лазы ёй, ды многа!

- Не! – па-ранейшаму цвёрда вымавіў каралевіч.

- А што ж тады? – не маглі даўмецца дзед з бабай.

- Здарыцца з вамі самае жахлівае, – паабяцаў каралевіч. – Трэба ж і мне цёмным чарадзеем пабыць, каб трохі баяліся.

- Што? – у адзін голас занепакоіліся тыя, неўпрыкмет пагадзіўшыся адно з адным.
- А не зловіш ты, дзедку, у возеры ніводнай рыбіны! І да іншых азёр не хадзі, тое ж самае будзе.
- Авой, зачараваў! – загаласіў дзед.
- Авой, жывымі ў вір зацягнуў! – загаласіла баба. – Лепей мяне русалкай зрабі, лягчэй плакаць будзе!
- Магу з вас абодвух русалак зчарадзеіць! Хочаце? – ласкава ўсміхнуўся каралевіч.
Дзед з бабай злосна маўчалі, відаць, рабіцца русалкамі не хацелі, а на каралевіча і зусім пакрыўдзіліся.
- А як не хочаце русалкамі рабіцца, – казаў далей каралевіч, – то вунь тую цікаўную ліску, што ў хмызняку хаваецца, за намі падглядае-падслухвае, злавіце ды жывую мне прынясіце.
Авой! І трэба ж было так неасцярожна вызірнуць! А каралевіч моцны чарадзей, адразу мяне заўважыў, хмызнякоўніка вунь як напужаў... “Ліска, ліска! Бяжы хавайся хутчэй”, – шэпча мне гэты шэры. – “А то зробішся рыжай русалкай...”. Рыжая русалка? Авой! Толькі так падумала, а ўжо з усёй моцы бегла! Дзед з бабкай – за мною.
Не дагналі. Куды ім, старым, за мной паспець. А ці ўцякла? Казалася ж даўно, што не сілай, а розумам, то бабка з дзедкам за розум і ўзяліся... І трэба ж было ім, баязліўцам, так каралевіча спалохацца! Я сама з той няспадзяванкі цэлую ночку ў хмызняковых нетрах прасядзела.
З раніцы яшчэ ніякай шкоды не ўчыніла, адно падумала, што трэба дармавой смятанай паласавацца, аж кажа мне хмызнякоўнік, што дзедка на мяне пастку ставіць! І як мне цяпер па сцежках лясных хадзіці? Ды і рыбаліць дзед не паехаў, чым жа пасля частавацца буду?
Да хаткі бабінай ды дзедавай цішком крадуся, нават курэй не ганяю. Карысці з гэтых крыкух-квактух, ніколі на іх і не квапілася. Крадуся, азіраюся, а бабка стараецца, варожыць: “Цьху-цьху-цьху! Каб жа ліска хвастком за пень зачапілася, у дзедава сіло папалася, вадзяному каралевічу аказалася. Цьху-цьху-цьху!”.
- Бабка, – кажу, – а бабка, хто ж так чаруе? Так нават квактух тваіх не замовіць! Не тое, што мяне...
- Цябе, чарадзейку рыжую, – звыкла так пазірае на мяне бабка. – Дык я ж цябе і замаўляць не буду, адно ў сіло ўблытаю, а там ужо няхай каралевіч-вадзянік рады якой дае!
Толькі мовіла тое, як з кустоўя, дзе я хавалася, раптам хлоп на мяне сіло, не чарадзейнае, звычайнае, але ж не выблытацца з такога! Тарганулася туды-сюды – аніяк.

Трэба было сябраваць і з кустоўнікам, які вунь хуценька хаваецца за хату, мільгнула запозненая думка.
А бабка ўзрадавана плешча ў ладкі:
- Папалася, зладзейка лясная, чарадзейка злая! Добра мы прыдумалі: дзед пайшоў з хаты, каб вочы табе адвесці, а я ж цябе паймала. Аддамо вадзяному каралевічу, дык ён нас прабачыць, а яшчэ будзе нам удосталь рыбы!
- От, бабка, будзе табе радасць, – кажу на гэта. – Раніцай рыба, удзень рыбка, а увечары рыбіна! Адно не буду, рыжая, прыгожая, па лясных сцяжанках хадзіць, табе з дзедам гаварыць: “Жывіце ладна ды згодна”.
- А калі ты нам такое казала? – не паверыла бабка.
Неўзабаве і дзед прытупуў. З таго, што ў пастцы сяджу, радуецца, як самаму вялікаму святу:
- А будзе ж нам рыба!
- Будзе, дзедку! Раніцай рыба, удзень рыбка, а увечары рыбіна! Адно не буду, рыжая, чарадзейная, па лясных сцежках хадзіць, цябе з бабай весяліць...
- Гэта ж калі ты нас весяліла? – запыталіся дзед з бабай падхапілі мяне ды ў пастцы панеслі да возера.
Там жа нас вадзяны каралевіч сустракае, проста на бераг выходзіць. І не дзівяцца таму дзед з бабай, а не нарадуюцца з такога гонару. Ужо ў думках рыбу лічаць.
- А ён па зямлі, як па вадзе, ходзіць, – кажу, хоць ніхто і не прасіў.
- А яна бабу з дзедам сварыць. Шкодзіць, – глядзіць мне ў вочы каралевіч.
- Злая, злая чарадзейка, – зацягнулі сваё дзед з бабай.
- Чарадзейка, – пагадзіўся каралевіч, і як чары азёрныя адгукнуліся, да мяне пацягнуліся, з пасткі вызвалілі.
Аблічча маё чалавечае вярнулі. Эх, з такой ахвотай удавалася рыжай шкоднай лісою... І хвосцік такі прывабны быў, і вушкі, і лапкі...
- Ты і цяпер шкодная... і вабная, – гэта каралевіч. – Будзе з каго цешыцца вялікім азёрам, будзе каго берагчы...
- Ты? – як ачомаліся дзед з бабай. – Тая самая... Па лясах хадзіла, людзей дзівіла. Не змянілася, не пастарэла, – і вачыма, нібы рыбіны, лыпаюць.
Ды раптам бабка як падскочыць:
- Ты ў чарадзейку тую... гэтую быў закаханы, ёлупень малады! Мяне хацеў кінуць!
- А ты мяне падманула, гюрза старая. З пачуццяў, што не да цябе, смяялася, сабе ўвесь век слугаваць прымусіла!
- Слугаваць прымусіла? Ды гэта я для цябе ўсё рабіла! Каб ты на чарцей так рабіў!
- Я не рабіў? Ды я табе штодня рыбы ўнь колькі цягаю. Злыдня ты, баба!
- Хлус ты, дзед! – І пабегла дадому, а дзед за ёю.
Нават рыбы як паболей прасіць забыліся.



## Арцём Лонскі

01.11.2000 г.,
ФГіМК, 41 гр., 4 курс

•Параіў бы ўсім пачытаць *"Запіскі Самсона Самасуя"* Андрэя Мрыя.

•Любімая цытата *"Любы канон, любая правільнасць - гэта вельмі нудна" (М. Жбанкоў)*

•Крэда ў літаратурнай творчасці: "*Лепш не пісаць, чым пісаць непрыкольна*".

### Прабіўшыся ў цішу

Стаяў звычайны зімні дзень,
звычайней за крышталь у шафе,
стаяў ліхтар, ад дрэва цень
ляжаў (з Эдгарам По ў той самы час
наяве размаўляў крумкач,
йшоў пеклам Дантэ, Маякоўскі
гарбату з сонцам піў...).
Вусач —
сутулы сілуэт Свярдлоўска
ляжаў, і, быццам на падушцы,
цягнуў сон слодычам ляноты —
ляжаў пад'езд, свой нос уткнуўшы
ў сумёт, прыступкі ўкрыўшы лёдам... —
так ціха мой канчаўся век,
нібы не марна... І што далей?
Я грыз акамянелы снег,
сто год таму ў сумёт апалы.

### Іваноў

Вясенняе сонца расплавіла снег.
І крочыць па чорнай зямлі чалавек.
Завуць чалавека Іван Іваноў —
ідзе і мурлыкае песню без слоў.
...Каб быў Івановым я сам, далібог,
я б быў бессмяротны і моцны, як бог,
я б песню без слоў напяваў і хадзіў
па попелу, праху і градках магіл...

Вершы Барыса Рыжага ў перакладзе Арцёма Лонскага



## Увасабленне ў лес

Цішэй! Прабіўшыся ў цішу, застыў.
Кожны шоргат небяспечны і цяжкі, як тона.
Лес уздрыгнуў і сціснуўся ў кроплі расы.
Наіўны! Не знае: я ім паланёны.
Агонь. Аплявухай успыхнуў, а іскры,
як іскры з вачэй, разляцеліся й гаснуць.
Мне з ім вельмі хораша, мерна і чыста.
Не трэба й алей ліць — агонь мой не згасне.
А ў горадзе ранак. Я думаю: і?
Па радыё нешта табе, яшчэ вяламу,
аб нейкай вайне... Ды не страшна зусім —
гэта толькі па радыё, а не па-сапраўднаму.
Я — ёсць светам. Не вам. Для мяне гэта важна.
Нарадзіўся, памру... І ўжо больш не ўваскрэсну.
І мне не пляваць, сапраўды, бо мне страшна.

***

Мой човен эмаліраваны,
вакенца, тумба і матрац,
мне жыць няўтульна і складана,
затое ўтульна паміраць.
Ляжу і думаю, як міла,
што гэтай белай прасцінай
учора крыўся той мужчына,
што сёння ў іншы свет пайшоў.
І ціха капае у ванну,
жыццё – памяты злом паяц –
выходзіць да мяне з туману
і бачыць: тумба і матрац...
І я спрабую крыху ўзняцца,
На яго вочы паглядзець.
Зірнуць у вочы, разрыдацца,
ніколі ўжо не спруцянець.

Вершы Барыса Рыжага ў перакладзе Арцёма Лонскага

**Сацрэалізм**

1.

Важна ўпрыгожаны школьны альбом
молатам цяжкім і вострым сярпом.

Брат, прыбяры, не паказвай больш мне,
зноўку я бачу, нібыта ўва сне:

васьмідзясяты, у лозунгах, год
грозна ўздымаецца, бы параход.

Дробненькі, сонны, па лёдзе, лайну
ў школу вось-вось упаду, але йду.

2.

Змрочна ідзе ўздоўж квартала народ.
Змрочна гудзіць за кварталам завод.

Песняй ліхою гучыць кожны кут.
Дзень, грамадзяне, працоўны ўжо тут.

Тое, што знаю, спазнаў у нудзе —
Няма анічога. Нікога. Нідзе.

Дзе б я ні быў — у благую пару
ў снезе благім завалюся й памру.

3.

«...тварык твой, тварык твой, тварык твой, тва...
будзе, анёл мой, чарней, чым дрыгва.

Пальчыкі, пальчыкі, пальчыкі, па...
будуць дрыжаць, бо навокал зіма.

Дробненькі, дробненькі, дробненькі, дро...
мне выдыхае зіма ў рукаво:

Твой яркі гальштук на тоненькай шы...
грэе, мой хлопчык, ці цёпла душы?»

4.

Тое, што знаю, спазнаў у нудзе —
Няма анічога. Нікога. Нідзе.

Дзе б я ні быў — у благую пару
ў снезе благім завалюся й памру.

Будзе завод нада мною гудзець.
Над намі з заводам – зорка гарэць.

Жылкамі чорнымі зорка цвіце.
І ўжо анічога. Нікога. Нідзе.

Вершы Барыса Рыжага ў перакладзе Арцёма Лонскага

Фенікс
№ 1 | 30 лістапада 2021 года



***

Зямлі кавалачак пад небам.
Паветра чыстае, як дожджык.
І на губах, як крошкі хлеба,
агні і зоры — неба вочы.

Я да хлява прыткнуся спінай.
Пустое не прапусціць вусціш.
Зямля — з ёй родны без прычыны.
І тым радней, чым менш ты значыш.

Хай пакладуць мяне ў грунт цёплы
там, дзе знайшоў на час я радасць.
З сырым бязмоўем перагною
прасцей нас разам будзе зладзіць,

Каб павярнуцца ў гэту небыль,
сказаць, не могучы больш змоўчаць:
«Зямлі кавалачак пад небам.
Паветра чыстае, як дожджык».

***

У правінцыйным гарадку,
калі ў кішэні ні капейкі,
узяўшы кніжачку ў руку,
сядзіш і паліш цыгарэткі,
у даль бясколерна глядзіш,
сам сабе кажаш ціха-ціха:
хачу ўзляцець вышэй за высь,
за дахі, зоры, гора скрыгат,
але трымае... Восень мо
лісцём шасціць: цішэй, бяскрылы.
Ці, можа, то зямлі ярмо.
Не, гравітацыя, мой мілы.



Вершы Барыса Рыжага ў перакладзе Арцёма Лонскага

Рубрыка Полацкага каледжа ВДУ
імя П.М. Машэрава



**Максим Кухлевский**

Учащийся 2 курса специальности «Начальное образование»
Научный руководитель – Кабылкова А.А., магистр филологических наук

***Перо***

*Я не ищу красивых слов,*
*Эпитетных морей…*
*Источник сил для новых строф –*
*Лишь свет души моей.*

*Известна мне превратность муз*
*На творческом пути:*
*Они облегчить могут груз,*
*Но могут и уйти.*

*Вот так уходит в тень поэт:*
*Ни строчки, ни стиха…*
*И говорят: поэта нет!*
*А нету лишь пера.*

*И пусть почти не верят в нас,*
*Что к людям мы близки,*
*Но светоч Слова не погас,*
*Сомненьям вопреки!*

*И кто бы что ни говорил,*
*Как ни было б старо,*
*Я вновь возьму флакон чернил*
*И новое перо.*

Рубрыка Полацкага каледжа ВДУ імя П.М. Машэрава



***Молодость. Творчество. Талант***

*Молодость – вечность. Талант – наважденье.*
*Творчество – ключ для развитья мечты,*
*Всё это вместе – весны пробужденье,*
*В небе сиянье прекрасной души,*

*Молодость - миг, что по жизни нос водит.*
*Свежести время, мечтаний, побед,*
*Она недостаток, который проходит*
*Оставив в душе несгораемый след.*

*Талант – это дар, что с рожденья даётся*
*С ним вместе по жизни нам долго идти.*
*Он опыт, любовь, вдохновенность в работе,*
*Способность сеяться, работать, любить.*

*А творчество – это начало бессмертья,*
*Уменье трудиться, творить, созидать.*
*Оно нашей жизни лицо пробужденье*
*От разных, порой нерешимых задач.*

*В творчестве много есть места таланту,*
*Вместе они чудеса создают,*
*Молодость – это начало таланта,*
*Творчество – долгий, пленительный труд.*

*Молодость, творчество, талант так похожи:*
*Это звено бесконечной цепи.*
*Все они вместе по жизни готовы*
*К цели по общей дороге идти.*

**Ирина Вышадко**

Учащаяся 3 курса специальности «Начальное образование»
Научный руководитель – Кабылкова А.А., магистр филологических наук

Рубрыка Полацкага каледжа ВДУ імя П.М. Машэрава

***Книга***

*В мире моторов, машин, интернета,*
*Среди компьютеров, разных миров*
*Книга – надёжный источник Планеты*
*С нами по жизни 500 лет идёт.*

*Долгим был путь к всем известной нам книге,*
*Люди писали на камнях не зря.*
*Чтоб сохранить нам историю мира*
*Глину использовать взялись сперва.*

*Греки на дощечках буквы писали*
*Тонькой палочкой всё выводя.*
*Эти таблички в печи обжигали,*
*Книги тяжёлыми были тогда.*

*Ну, а в Египте, «папирус» был главным.*
*В Африке жаркой он только растёт.*
*Длинные свитки с трудом получались,*
*Тоненькой кистью писали на нём.*

*Свиток папирусный плохо хранился,*
*Трескался очень, и вот тогда*
*Прочный пергамент в быту появился:*
*Тонкая кожа – прочна и нежна.*

*Книги такие были дорогими,*
*Делались долго, вручную всегда.*
*Ручкой из перьев строка выводилась,*
*Тексты монахи писали тогда.*

*Вслед за пергаментом стала бумага,*
*Древний китаец её изобрёл,*
*Белая, гладкая, лучше не надо,*
*Книги писались вручную пером.*

*Чтобы облегчить труд долгий тяжёлый,*
*Немец Гутенберг станок изобрёл,*
*И сквозь столетия птицей свободной*
*Книга вошла в современный наш дом.*

*Книга – ты лучший наш в жизни учитель,*
*Книга – ты главный и верный наш друг,*
*Книга – разведчик, советчик, строитель,*
*Книга – ты важный спасательный круг.*



Рубрыка Полацкага каледжа ВДУ
імя П.М. Машэрава

***Ромашковое поле***

*Сегодня первый день войны.*
*пишу об этом рано утром.*
*Ещё не знаю, как долго ты*
*протянешь в месте том, а вдруг он*
*нападѐт? Поранит? Покалечит?*
*Отец... Пойми, что если он тебя убьѐт,*
*то кто же будет так сердечно*
*мне песню петь из года в год?...*

*Свистели пули на рассвете,*
*сейчас, наверное, придут.*
*Надеюсь, избежишь ты смерти,*
*а я, кажись, погибну тут.*
*А тут ромашковое поле*
*совсем недавно расцвело,*
*уже оно залито кровью.*
*А солнце только что взошло...*



**Алиса Ворон**

Учащаяся 2 курса
специальности
«Иностранный язык»
Научный руководитель –
Кабылкова А.А., магистр
филологических наук

Рубрыка Полацкага каледжа ВДУ
імя П.М. Машэрава



**Надежда Маркелова**

Учащаяся 2 курса специальности «Дошкольное образование»
Научный руководитель – Кабылкова А.А., магистр филологических наук



***Мама!***

*Чудесней нет на свете слова,*
*Роднее в мире нет его.*
*Оно - судьбы моей основа.*
*Оно! И больше ничего.*
*Мама!*

*Дороже слова нет на свете,*
*Дороже злата, серебра.*
*Как тот маяк во тьме, что светит,*
*Горит, как яркая звезда.*
*Мама!*

*В жару и в зной оно водою,*
*Нам обернётся ключевой.*
*Зимой морозной – теплотою*
*согреет сердце, даст покой.*
*Мама!*

*В голодный год кусочком хлеба,*
*Оно ложится на столе.*
*В неволе – быстрой птицей в небо*
*Парит оно в рассветной мгле.*
*Мама!*

*Ты счастье мне дала безмерно*
*Хотя бы тем, что родила.*
*Подругой стала ты мне верной,*
*Тропою жизни повела.*
*Мама!*

*Бегут года неумолимо,*
*Тускнеют призрачно мечты...*
*Прекрасной и всегда любимой*
*В душе осталась только ты!*
*Мама!*

Фенікс
№ 1 30 лістапада 2021 года
Рубрыка Полацкага каледжа ВДУ
імя П.М. Машэрава



***

*Есть много разных глаз на свете,*
*Но для меня прекрасны лишь одни,*
*Глаза наполнены любовью, теплом души и доброты.*

*И не важно, какого они цвета,*
*Будь то зелёный, карий, голубой.*
*Ведь важно, что в душе поэта,*
*Который пишет про любовь.*

**Варвара Савицкая**

Учащаяся 1 курса специальности «Музыкальное образование»
Научный руководитель – Кабылкова А.А., магистр филологических наук

Рубрыка Полацкага каледжа ВДУ
імя П.М. Машэрава

***

*Приехав в край, где дом родной,*
*Я восхищаюсь, вспоминая,*
*Что гордость чувствую живой.*
*Живой, да потому что знаю,*
*Что нет красивее страны*
*Страны с огромным синим небом,*
*Страны, с хорошими людьми.*
*Страны, где я родился, верю,*
*Верю, что наступая на порог,*
*Тебе откроют дверь с улыбкой*
*И скажут:*
*"Мілы, падыйдзі, сынок,*
*Дай прытулю цябе да сэрца.*
*А ты прысяць, перакусі,*
*І сонца выйдзе у акенца".*
*И речь народная так нежна,*
*Приятно уху слышать думы,*
*Как молвит сладостно Земля*
*И верит: мы гордимся, любим!*
*Ах, как прекрасны те поля,*
*Дарившие нам милость хлеба,*
*Чтоб за столом всегда была*
*Моя любовь с кусочком белым!*
*Ах, как красивы те леса,*
*Леса зелёные, густые,*
*Где ели с шишками — краса!*
*Краса с друзьями молодыми.*
*Я буду молвить сотню раз,*
*Как я ценю страну родную,*
*Где веселиться зоркий глаз,*
*И сердце замерло с любовью.*



**Александра Криводубская**

Учащаяся 1 курса специальности «Иностранный язык»
Научный руководитель – Матсопаева Л.Н., магистр педогогических наук



**Виктория Новодворская**

Учащаяся 1 курса специальности «Организация гостиничных услуг»
Научный руководитель – Матсопаева Л.Н., магистр педогогических наук

***Мой май - мой рай!***

*Бывает в жизни грусть, печаль,*
*Но а в душе тоска.*
*Но на минуту хочу в май,*
*Чтоб подобрать слова.*
*Хочу тепло я, смех, улыбку,*
*Крепкие объятья,*
*Чтоб в мире был уют и счастье.*
*Хочу тепло я, смех, улыбку,*
*Хорошую погоду .*
*Ну не могу я рано утром смотреть лишь на природу.*
*Хочу пройти по той траве,*
*Которая с духами*
*Весны моей родной, приятной,*
*Самой аккуратной.*
*Хочу смотреть, как пляшут дети,*
*Смеются и играют.*
*Как жизнь цветет и пахнет,*
*Да просто расцветает.*
*Хочу увидеть наяву свою сирень родную,*
*Тот самый запах, цвет и краску,*
*А не простую сказку.*
*Пора вернуться в светлый май,*
*Ведь для меня он – просто рай.*

Рубрыка Полацкага каледжа ВДУ
імя П.М. Машэрава

**_Любовь к жизни_**

*Я восхищаюсь всем вокруг,*
*И жизнь мой самый лучший друг.*
*Я помню солнце, помню воду*
*И даже мокрую погоду.*

*Я помню каждый ветерок*
*И каждый шепот листьев.*
*Никто не знает, каково*
*Лишь от души зависеть.*

*Ведь жизнь одна есть у меня.*
*Её ценю и грею я.*
*Всё то, что есть сейчас у нас, –*
*Приятно видеть тысячу раз !*

*Приятно слушать, принимать,*
*Но также верить и мечтать,*
*Что будет всё вокруг*
*Как самый сильный и огромный круг.*

*Те самые прогулочки*
*По узким-узким улочкам.*
*Тот самый певчий голосок ,*
*Который хочется услышать не один разок.*

*Останется у каждого внутри*
*И будет лишь идти-идти,*
*Чтобы все запомнили его,*
*Чтобы знали, что такое хорошо.*

*Пусть греет сердце доброта,*
*Веселье, мир и красота.*

*Ведь жизнь дана лишь тем,*
*Кто миру стал не просто гостем,*
*Тому, кто ценит жизнь и не представит ей угрозу.*

# ФГіМК фестывальны!

На факультэце гуманітарыстыкі і моўных камунікацый **з 6 па 10 снежня** ў **7-ы раз** пройдзе ***Фестываль беларускага слова.***

Сёлетні фестываль вызначаецца тэматычнымі мерапрыемствамі, прысвечанымі беларускай культуры. У студэнтаў і выкладчыкаў будзе магчымасць пазнаёміцца *з традыцыямі беларускага кірмашу і пакаштаваць стравы беларускай кухні. Таямніцы беларускіх рамёстваў* можна будзе спасцігнуць у майстэрнях мастацка-графічнага факультэта і сабраць свой уласны лэпбук. *Прэзентацыі лепшых музеяў Віцебска і музейныя экспазіцыі* пазнаёмяць студэнтаў са старажытнымі экспанатамі. Студэнты ФГіМК апрабуюць свае сілы ў якасці артыстаў у пастаноўках будучых рэжысёраў і выйдуць упершыню на сваю "малую сцэну" ў якасці герояў літаратурных твораў. **130-годдзе Максіма Багдановіча** аздобіць слуцкі пояс, які студэнты саткуць самі. "Адчуй наш вайб!" разам з намі на студэнцкім капусніку. Далучайся да роднага слова!

**Мы чакаем цябе!**

*Праграма фестывалю на с. 31*

## Внимание! Конкурс!

Кафедра германской филологии объявляет конкурс художественного перевода стихотворений М. Богдановича "BogdanoWEch: перакладзі ж мяне, паэт!" в рамках "Фестывалю беларускага слова". Приём работ осуществляется до 6 декабря, подведение итогов и награждение - 9 декабря.

За подробной информацией обращайтесь в 623 аудиторию к Наталье Фёдоровне Хомуськовой.

## Мы вас чакаем!

**Паважаныя чытачы!**

Запрашаем усіх жадаючых паўдзельнічаць у працы літаратурнага часопіса **"Літаратурны autographum".**

Свае творы просьба прыносіць на кафедру літаратуры (аўд 606) або дасылаць па электроннай пошце.



Кантактная асоба і галоўны рэдактар - студэнтка 41-й групы Дар'я Мамошына
+375 (33) 378-71-17
dashamamoshina@yandex.by

# ФАКУЛЬТЭТ ГУМАНІТАРЫСТЫКІ І МОЎНЫХ КАМУНІКАЦЫЙ

## ПРАГРАМА

## ФЕСТЫВАЛЮ БЕЛАРУСКАГА СЛОВА

## (ПРАХОДЗІЦЬ З 06.12.2021 ПА 11.12.2021)

| Дата | Час | Месца правядзення | Назва мерапрыемства | Адказныя за правядзенне | Удзельнікі |
|---|---|---|---|---|---|
| 06.12.2021 | 13.00 | ФГіМК, хол 6-га паверха | **Дзень беларускай кухні**<br>Беларускі кірмаш<br>"Дзякуй скажаш, як з'ясі!": весялімся, усіх частуем, забаўляемся, смакуем. | Студэнты 21 групы, выкладчыкі кафедры | Студэнты ФГіМК, выкладчыкі |
| 07.12.2021 | 11.00 – 13.00 | Цэнтры рамёстваў<br>г. Віцебска<br>Майстэрні<br>мастацка-графічнага факультэта | **Дзень беларускіх рамёстваў**<br>Вытокі рамяства ў Беларусі<br>Беларускія ўмельцы (экскурсіі ў майстэрні рамёстваў)<br>"Збяры свой лэпбук: (ткацтва, дрэваапрацоўка, ганчарная справа, саломапляценне)" | Мартынкевіч С.В.,<br>Семянькова Г.К. | Студэнты ФГіМК |
| | 13.05 - 14.30 | 607 аўд. | **Віртуальнае падарожжа** "Ведай нашых! Беларусы, якія прынеслі славу іншым народам" (Цэнтр славянскіх моў і культур) | Бабіч Ю.М. | |
| 08.12.2021 | На працягу дня | ФГіМК | **Дзень беларускага тэатра**<br>"Мая малая сцэна" : студэнты ФГіМК у тэатральных пастаноўках<br>**Дзень беларускага музея**<br>Экскурсіі ў музеі г. Віцебск<br>Прэзентацыя "Лепшыя музеі Віцебска і Віцебскай вобласці" | Мартынкевіч С.В.<br>Дулаў А.М.<br>Півавар М.В. | Студэнты і выкладчыкі |
| | 13.05 - 14.30 | УА "Сярэдняя школа № 4 г. Віцебска" (філіял кафедры) | **"Ёсць адна толькі мудрасць жыцця…":** адкрытае пасяджэнне студэнцкага навуковага гуртка "Мова ў кантэксце культуры" кафедры беларускага мовазнаўства | Дзядова А.С.<br>Півавар К.С. | Студэнты ФГіМК, настаўнікі, вучні 11 класа УА "Сярэдняя школа № 4 г. Віцебска" |
| 09.12.2021 | 16.00 - 16.20<br>16.30 | ДУ "Віцебская абласная бібліятэка імя Леніна" | **Дзень беларускай кнігі (да 130-годдзя Максіма Багдановіча)**<br>Конкурс мастацкіх перакладаў "BogdanoWEch: Перакладзі ж мяне, паэт!"<br>**Літаратурная кампазіцыя "Усё знікае, праходзіць, як дым, светлы след будзе вечна жывым" (М. Багдановіч)**<br>**Флэшмоб "Створым слуцкі пояс разам"**<br>**Прэзентацыя навукова-папулярнага выдання** "Вялікая энцыклапедыя маленькага прафесара: Традыцыйная культура і побыт беларусаў" | Хамуськова Н.Ф.<br>Падстаўленка В.Ф.<br>Аксянчук Г.Я.<br>Півавар К.С. | Студэнты ФГіМК |
| 10.12.2021 | 13.00 - 14.00 | Актавая зала | **Дзень студэнцкай творчасці "Беларускі калейдаскоп"**<br>**Студэнцкі капуснік "Адчуй наш вайб!"** | Студэнты ФГіМК | Студэнты, выкладчыкі |
| **Фестываль беларускага слова ў анлайн-фармаце (чэленджы)** | | | | | |
| 06.12 - 10.12 | На працягу тыдня | Instagram vsu_fhlc УКантакце<br>TikTok Тэлеграм | **#МОЙФГіМК**<br>**#Касплэй па-беларуску**<br>**#МОЙБАГДАНОВІЧ** | Радзюль В.Ю. | Студэнты ФГіМК |